Дадатак да "Настаўніцкай газеты" 30 ліпеня 2011 года

# АБІТУРЫЕНТ

**У ВНУ завяршыўся прыём на бюджэтную форму**
Першыя высновы
Стар. 10

**Апошняя інстанцыя**
З якімі пытаннямі абітурыенты і іх бацькі звяртаюцца на гарачыя лініі
Стар. 11

**Крок наперад**
Новыя тэхналогіі ў сістэме прыёму і навучання
Стар. 12—13

**Сплаў мастацтва, навукі і рамяства**
Асаблівасці ўступнай кампаніі ў медыцынскай ВНУ
Стар. 14

**ЦТ слязам не верыць**
Чаму тэсціраванне лепш, чым традыцыйны экзамен
Стар. 15

**Непаступленне ў ВНУ — гэта не тупік**
Альтэрнатывай могуць стаць сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы
Стар. 16

# Варыянтаў — шмат, выбар — адзін!




Шлях Антона Саковіча ў вялікую фізіку пачаўся нестандартна. У школе ён ведаў гэты прадмет, паважаў яго, але не захапляўся ім. Усё змянілася тады, калі настаўнік у 8 класе прапанаваў Антону выступіць на раённай алімпіядзе: выпадаў шанс "прагуляць" кантрольную па біялогіі, і Антон пагадзіўся. І з той алімпіяды ён вяртаўся дадому ўжо ўлюбёным у фізіку.

"Справа ў тым, што школьныя задачы па фізіцы вельмі простыя, таму цяжка было зразумець, падабаецца мне гэты прадмет ці не, — расказвае Антон. — А вось заблытаныя алімпіядныя задачы дапамаглі зразумець: так, падабаецца. Гэта маё".

Ужо будучы вучнем 29-й сталічнай гімназіі, юнак неаднаразова выступаў і перамагаў на раённых, гарадскіх і рэспубліканскіх алімпіядах па фізіцы. Сёлета ён стаў бронзавым прызёрам міжнароднай фізічнай алімпіяды ў Тайландзе.

"Не магу сказаць, што там было больш складана выступаць, чым на рэспубліканскай алімпіядзе, — дзеліцца ўражаннямі Антон, — але не таму, што заданні былі надта лёгкімі, а таму, што ўзровень нашай рэспубліканскай алімпіяды па фізіцы адпавядае міжнароднаму".

Паводле Правіл прыёму, Антон Саковіч атрымаў права паступаць без уступных іспытаў практычна на любую спецыяльнасць тэхнічнага профілю, але насамрэч у яго не было іншага выбару, акрамя спецыяльнасці "Фізіка (навукова-даследчая дзейнасць)" на фізічным факультэце БДУ.

"Мне падабаецца фундаментальная фізіка, і я буду ёй займацца", — заяўляе Антон, не зважаючы на шматлікія падманныя размовы пра конкурсы, прахадныя балы і прэстыжнасць іншых прафесій. Рэспект такім абітурыентам!

Галіна СІДАРОВІЧ.
sidarovich@nastgaz.by
Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

**У панядзелак у ВНУ другога патоку скончыўся прыём дакументаў на бюджэтную форму навучання. Як і звычайна, апошні дзень, а асабліва апошнія гадзіны прыёму аказаліся самымі напружанымі. Допуск абітурыентаў у ВНУ быў спынены ў 18 гадзін, але, каб зарэгістраваць тых, хто на той момант застаўся ў будынках, многім прыёмным камісіям прыйшлося працаваць да позняга вечара.**



# Масавая падача заяў у апошні дзень — гэта не праблема,

## *лічаць у БНТУ*



У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце так званую праблему апошняга дня вырашылі дастойна. Ды і ўвогуле ў ВНУ не лічаць яе праблемай. "Наўрад ці трэба неяк змагацца з тым, што абітурыенты супастаўляюць свае інтарэсы і магчымасці з аб'ектыўнай сітуацыяй. Яны імкнуцца паступіць на абраны напрамак і пры гэтым, пажадана, на бюджэт. Гэта іх права, — лічыць адказны сакратар прыёмнай камісіі БНТУ дэкан прыборабудаўнічага факультэта Аляксандр Малярэвіч. — Іншая справа, што хацелася б масавы прыём заяў пачынаць не пасля 15 гадзін, калі мы апошні раз абнаўлялі інфармацыю аб пададзеных дакументах, а крыху раней. Магчыма, апошняе абнаўленне трэба рабіць у 12.00. Гэта знізіла б нагрузку на прыёмную камісію. Але, дзякуючы арганізаванай, адладжанай рабоце і дастатковай колькасці рэгістратараў, мы паспелі прыняць дакументы ва ўсіх жадаючых".

Прыём дакументаў у БНТУ сёлета вёўся ў розных карпусах. І абітурыентам, якія доўга выбіралі паміж факультэтамі, прыйшлося несаладка. Затое ў факультэцкіх прыёмных камісіях не было вялікай колькасці людзей і падаць дакументы можна было даволі хутка. "Каб правесці прыём усіх заяў у адным месцы, нам прыйшлося б арэндаваць "Мінск-Арэну", — жартуе адказны сакратар. У гэтым годзе БНТУ прымае на бюджэтнае навучанне 3300 чалавек, а заявы падалі каля 7200.

На момант апошняга абнаўлення статыстыкі пададзеных заяў аказалася, што ёсць вакантныя бюджэтныя месцы на 13 спецыяльнасцях дзённай формы і на 4 — завочнай. Але, па словах адказнага сакратара прыёмнай камісіі, да канца дня ўсе бюджэтныя месцы былі запоўнены. Трэба зазначыць, што ў гэтым годзе на шэрагу інжынерных спецыяльнасцей, якія вельмі запатрабаваны рэальным сектарам эканомікі, у БНТУ быў павялічаны прыём на бюджэт.

А.М.Малярэвіч падкрэслівае, што калі выбар спецыяльнасці асэнсаваны, то дакументы падаюцца раней. А ў апошні дзень ва ўніверсітэце можна было сустрэць нават абітурыентаў з вельмі высокімі баламі, якія вагаліся паміж некалькімі прэстыжнымі спецыяльнасцямі, напрыклад, будаўнічымі і энергетычнымі, дзе максімальны бал перавышаў 360. У цэлым жа дынаміка рэгістрацыі абітурыентаў сведчыць аб тым, што многія з іх вызначыліся са спецыяльнасцю загадзя. Так, у першы дзень падалі заявы каля 500 чалавек, і ў кожны наступны дзень колькасць зарэгістраваных паступова павялічвалася. Нарэшце, 25 ліпеня заявы падалі 2200 абітурыентаў.

"На жаль, частка маладых людзей, падаючы дакументы ў апошні дзень, трапіла ў непрыемнае становішча па сваёй жа віне, — расказаў Аляксандр Міхайлавіч. — У некага знайшлася памылка друку ў сертыфікаце, нехта змяніў пашпарт або прозвішча пасля праходжання цэнтралізаванага тэсціравання, і даныя ў пашпарце ўжо не адпавядалі даным сертыфікатаў. РІКВ, канечне, вельмі аператыўна замяняе сертыфікаты ў такіх выпадках, але ўявіце сабе нервовае напружанне абітурыентаў".

Ужо 26 ліпеня ў БНТУ абнародавалі канчатковую інфармацыю аб колькасці прынятых дакументаў, хаця ВНУ і не абавязаны гэтага рабіць да моманту правядзення залічэння. "Прыёмнай камісіі больш камфортна працаваць ва ўмовах адкрытасці і празрыстасці", — сцвярджае Аляксандр Малярэвіч. Такім чынам, паводле папярэдніх даных, самыя высокія прахадныя балы (звыш 300) традыцыйна чакаюцца на будаўнічым і энергетычным факультэтах, а таксама на факультэце інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі.

У БНТУ з цікавасцю назіраюць за эксперыментам па ўкараненні аўтаматызаванай сістэмы залічэння, які зараз праводзіцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. "Нейкі час назад была спроба прымаць дакументы ў некалькі ВНУ адначасова, але тады сістэма адукацыі была да гэтага не гатова, паколькі заявы апрацоўваліся ўручную. Зараз, пры электроннай апрацоўцы, усё будзе намнога прасцей і яшчэ больш празрыста, — лічыць Аляксандр Міхайлавіч. — Упэўнены, што сістэма электроннага залічэння будзе вельмі запатрабаванай, бо яна істотна пашырыць магчымасці абітурыентаў, спросціць уступную кампанію, хаця і вымусіць ВНУ канкураваць паміж сабой".

**Звычайна ў апошні дзень рэгістрацыі абітурыентаў на платнае навучанне сітуацыя масавай падачы заяў паўтараецца, таму БНТУ папярэджвае: уважліва правярайце набор сваіх дакументаў і прыходзьце ў прыёмную камісію раней!**

**Кошт навучання на платнай форме ў БНТУ ў залежнасці ад спецыяльнасці складаў дагэтуль 5,2—5,5 мільёна рублёў. У жніўні чакаецца павышэнне кошту да 20%. Гэта абсалютна абгрунтаваныя лічбы, лічаць ва ўніверсітэце, бо тэхнічная адукацыя таго вартая. У БНТУ ідуць насустрач платнікам — дазваляюць плаціць у растэрміноўку. Часцей практыкай становяцца трохбаковыя дагаворы, паводле якіх навучанне студэнтаў аплачваюць прадпрыемствы.**

Іна НІКІЦЕНКА.
*nikitsenka@nastgaz.by*
Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

# У БДПУ імя М.Танка "дашкольнікі" стварылі аншлаг

**Сёлетнія вынікі набору на дзённае аддзяленне бюджэтнай формы атрымання адукацыі ў педагагічным універсітэце не даюць нагоды для суму, хоць агульная колькасць абітурыентаў па краіне і зменшылася.**

"Планаваную колькасць студэнтаў, за выключэннем некалькіх спецыяльнасцей, універсітэт набраў", — паведаміў нашаму выданню адказны сакратар прыёмнай камісіі БДПУ Сяргей Уладзіміравіч Якавенка.

Аказваецца, вакантнымі з году ў год застаюцца некалькі месцаў пры падачы дакументаў на фізічны факультэт вядучай педагагічнай установы краіны. (Сёлета, дарэчы, на названы факультэт выдзелена 135 бюджэтных месцаў.) Пры гэтым спецыяльнасць "Фізіка. Інфарматыка" запаўняецца цалкам, недахоп жа адзначаецца на "Фізіку. Матэматыку" і "Фізіку. Тэхнічную творчасць". Вось і сёлета на спецыяльнасць "Фізіка. Матэматыка" было выдзелена 50 бюджэтных месцаў, а набрана 42 чалавекі; і 16 чалавек пры плане 20 набраны на спецыяльнасць "Фізіка. Тэхнічная творчасць". Тлумачачы гэтую з'яву, С.Якавенка гаворыць аб тым, што юнакі, якія жадаюць звязаць сваё далейшае жыццё з фізікай, аддаюць перавагу іншым ВНУ, дзе прапануоўваецца вялікі выбар тэхнічных і навуковых спецыяльнасцей: БНТУ, БДУ, БДУІР.

— А што да тых, хто прыходзіць да нас з нізкімі баламі, то яны надоўга не затрымліваюцца ва ўніверсітэце, — гаворыць Сяргей Уладзіміравіч. — Ва ўсім ёсць свае перавагі і свае адмоўныя бакі, гэта тычыцца і цэнтралізаванага тэсціравання. На жаль, сёння пры выбары ВНУ галоўную ролю адыгрываюць не схільнасці абітурыента, а колькасць набраных ім балаў. Так, БДПУ дагэтуль праводзіць прафарыентацыйную работу сярод школьнікаў — у нас захавалася і дзейнічае сістэма педагагічных класаў: ва ўсіх абласцях краіны ёсць школы, з якімі мы супрацоўнічаем; вучні гэтых школ два разы ў год прыязджаюць ва ўніверсітэт на вучобу, здаюць экзамены. Мы даём ім добрую падрыхтоўку, запрашаем паступаць да нас, але ж прымусіць не можам. Напрыклад, у пазамінулым годзе выпускнік аднаго з такіх педкласаў набраў па англійскай мове 99 балаў і пайшоў... у лінгвістычны ўніверсітэт. Што ж тут зробіш? Раней у нас быў конкурс нават сярод медалістаў (на той жа самы матфак), цяпер жа, з увядзеннем тэстаў, карціна зусім іншая. Так ужо склалася, што сярод абітурыентаў, якія набіраюць звыш 300 балаў, у бок БДПУ пазіраюць адзінкі. Але ёсць у нас юнакі і дзяўчаты, якія набралі і 313, і 326 балаў, — гэта людзі, якія адчуваюць у сабе педагагічнае прызванне.

Увогуле ж, вынікамі прыёму дакументаў ва ўніверсітэце сёння задаволены. Праўда, спачатку ў прыёме адзначалася пэўнае адставанне ў параўнанні з мінулым годам, аднак потым удалося "дагнаць", і запланаваная колькасць груп і нагрузка выкладчыкаў апраўдаліся. Агульны конкурс па БДПУ складае 1,85 заявы на месца.

Так, на факультэт дашкольнай адукацыі пададзена 250 заяў (выдзелена 160 бюджэтных месцаў), на факультэт пачатковай адукацыі — 137 заяў (план — 70), фізічнага выхавання — 61 (запланавана набраць 20 чалавек). На спецыяльнасць "Лагапедыя. Спецыяльная псіхалогія" пры плане 10 пададзена 63 заявы. (Факультэт спецыяльнай адукацыі, як бюджэтнае, так і платнае навучанне, заўсёды карыстаецца вялікім попытам. — **Заўв. аўт.**) Атрымаць спецыяльнасць "Руская мова і літаратура. Замежная мова (італьянская)" пажадалі 17 абітурыентаў (выдзелена 5 месцаў), "Гісторыю і сацыяльна-палітычныя дысцыпліны" выбралі 50 чалавек (15 месцаў), "Біялогіі. Хіміі" аддалі перавагу 135 абітурыентаў пры плане 60. Прычым асноўная колькасць "хімікаў" і "біёлагаў" падалі дакументы ў апошні дзень, 25 ліпеня, — гэта так званыя перабежчыкі з ліку тых, хто не прайшоў па балах у медыцынскі ўніверсітэт.

Канфліктных сітуацый падчас прыёму дакументаў у БДПУ імя Максіма Танка сёлета не адзначалася. Мелі месца толькі недарэчнасці, прычынай якіх у першую чаргу выступае няўважлівасць і бесталковасць некаторых абітурыентаў.

— Напрыклад, маладыя людзі прыносяць медыцынскія даведкі, у якіх не стаіць подпіс галоўнага ўрача лячэбнай установы, — расказвае С.У.Якавенка. — Такую даведку мы, канечне, прыняць не можам, абітурыенты ж чамусьці лічаць, што ў нас завышаныя патрабаванні. Здаралася і такое, што падчас падачы дакументаў у юнака ці дзяўчыны не аказвалася з сабой пашпарта. А бо дзяўчына выходзіць замуж, мяняе прозвішча, а прадаставіць новыя звесткі пра сябе забывае. Гэтыя "дробязі" могуць адыграць вырашальную ролю, асабліва ў апошні дзень за паўгадзіны да заканчэння прыёму дакументаў.

Маладым людзям, якія плануюць паступаць на платнае навучанне, Сяргей Уладзіміравіч раіць спачатку зайсці на сайт БДПУ імя Максіма Танка, каб атрымаць усю неабходную інфармацыю.

— Шчыра скажу: 200 тэлефанаванняў у дзень з пытаннем "Якія дакументы трэба падаваць?" надта стамляюць прыёмную камісію, — прызнаўся С.У.Якавенка.

Глафіра ЛЯТКОЎСКАЯ.
*liatkouskaya@nastgaz.by*

**Як мы ўжо паведамлялі, у перыяд уступнай кампаніі на базе Камітэта дзяржаўнага кантролю працуе гарачая лінія Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ. Патэлефанаваць спецыялістам са сваімі пытаннямі і праблемамі можна будзе да канца жніўня. Сёння мы аналізуем статыстыку зваротаў абітурыентаў і іх бацькоў разам з адказным сакратаром Дзяржкамісіі намеснікам начальніка ўпраўлення Дэпартамента кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі Ірынай БУЦЬКО.**



# Апошняя інстанцыя

## З якімі пытаннямі абітурыенты і іх бацькі звяртаюцца ў Дзяржкамісію

***— Ірына Яўгенаўна, колькі зваротаў на гарачую лінію зарэгістравана з пачатку яе работы? Гэта больш ці менш, чым у мінулым годзе?***

— Першыя звароты мы пачалі рэгістраваць амаль з самага пачатку стварэння Дзяржаўнай камісіі. На сёння (раніца 27 ліпеня. — **Аўт.**) на гарачую лінію паступіла 62 тэлефанаванні. На гэтую ж дату ў мінулым годзе было зафіксавана 74 званкі. У цэлым, у апошнія гады адзначаецца тэндэнцыя скарачэння зваротаў грамадзян на гарачую лінію. Безумоўна, гэта паказчык стабільнасці Правіл прыёму і зразумеласці "правіл гульні".

***— Якія праблемы больш за ўсё хвалююць абітурыентаў і іх бацькоў?***

— Найбольш напружаным быў перыяд напярэдадні і ў самым пачатку цэнтралізаванага тэсціравання. Увогуле, асаблівасцей ЦТ тычыліся 45 тэлефанаванняў. Прычым традыцыйнымі пытаннямі былі: "Як зарэгістравацца на праходжанне ЦТ у рэзервовы дзень?", "Ці можна прайсці на цэнтралізаванае тэсціраванне пры адсутнасці пашпарта?"

Большасць пытанняў мела ўдакладняльны, кансультацыйны характар. Пасля заканчэння тэсціравання сталі паступаць звароты наконт парадку падачы дакументаў, конкурсаў, прахадных балаў і г.д. Напрыклад, бацькі цікавіліся, ці могуць яны падаць дакументы замест дзяцей. На жаль, Правілы прыёму гэтага не дазваляюць. Абітурыент павінен самастойна выбіраць і ўказваць спецыяльнасць, таму што ў бацькоў часам бывае свой асабісты пункт гледжання адносна будучыні дзіцяці.

***— Як вы лічыце, чаму грамадзяне звяртаюцца менавіта ў Дзяржкамісію? Можа, таму, што не давяраюць прыёмным камісіям, Рэспубліканскаму інстытуту кантролю ведаў?***

— Дзяржкамісія кантралюе ўступную кампанію больш за 15 гадоў, тэлефон яе гарачай лініі пастаянны і шырока вядомы. Часта бацькі, упэўненыя, што з імі паступілі несправядліва, лічаць, што дапамагчы можа толькі высокая інстанцыя. Хаця ў большасці выпадкаў пытанні паспяхова вырашаюцца на месцах.

Напрыклад, некалькі чалавек сцвярджалі, што ім выстаўлены неаб'ектыўныя адзнакі на цэнтралізаваным тэсціраванні. У першую чаргу ў такіх выпадках мы раілі звяртацца ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, які праводзіў ацэньванне работ. А са свайго боку таксама тлумачылі: на цэнтралізаваным тэсціраванні мае значэнне не абсалютны бал, а адносны — месца ў шэрагу ўсіх астатніх абітурыентаў. Па маіх назіраннях, падазрэнні ў неаб'ектыўнасці вынікаў ЦТ узнікаюць менавіта тады, калі ёсць вельмі заўважная розніца паміж балам тэсціравання і балам у атэстаце. Параўноўваць бал цэнтралізаванага тэсціравання і школьны бал па прадмеце некарэктна. Задача ЦТ — ранжыраваць удзельнікаў адносна адзін аднаго паводле ўзроўню ведаў. На жаль, многія бацькі і абітурыенты гэтага не разумеюць.

Хачу адзначыць, што Дзяржкамісія цесна супрацоўнічае з Міністэрствам адукацыі, у тым ліку гэта тычыцца і спецыялістаў, якія працуюць на нашых гарачых лініях.

Распараджэннем старшыні Дзяржаўнай камісіі ў кожнай вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе зараз дзейнічаюць лакальныя камісіі, якія цалкам кантралююць ход падачы і апрацоўкі дакументаў, уступныя выпрабаванні, залічэнне, сочаць за захаваннем норм заканадаўства, удзельнічаюць у разглядзе і вырашэнні праблемных сітуацый. Акрамя таго, у кожнай вобласці працуюць абласныя камісіі, куды абітурыенты і іх бацькі могуць звяртацца з усімі пытаннямі, якія іх непакояць.

***— Асабіста мне вельмі імпануе прынцып, якім кіруецца Дзяржаўная камісія, — дзейнічаць у інтарэсах і на карысць абітурыентаў. Але ці заўсёды так атрымліваецца?***

— Кожны зварот на гарачую лінію разглядаецца індывідуальна. Напрыклад, у перыяд выдачы сертыфікатаў ЦТ мы атрымалі некалькі сігналаў аб тым, што ў некаторых пунктах тэсціравання няязручны графік работы. У прыватнасці, абітурыенты, якія працуюць, не маглі забраць сертыфікаты. Па патрабаванні Дзяржкамісіі час работы пунктаў тэсціравання быў падоўжаны.

Часам да нас звяртаюцца з просьбамі, якія не ўваходзяць у кампетэцыю Дзяржаўнай камісіі, напрыклад, змяніць тэрміны падачы дакументаў, перанесці экзамены, выдзяліць дадатковыя месцы. У такіх сітуацыях мы нічым не можам дапамагчы.

Дзяржаўная камісія карыстаецца тымі ж заканадаўчымі нормамі, што і прыёмныя камісіі навучальных устаноў. Калі нам абітурыент расказвае, што ён "праспаў цэнтралізаванае тэсціраванне і не хоча з-за гэтага губляць шанс на паступленне ў ВНУ", то ў такой сітуацыі, на жаль, мы можам толькі выказаць спачуванне. Ці параіць нейкія іншыя варыянты, напрыклад, паспрабаваць паступіць у ССНУ, дзе патрабуецца толькі два сертыфікаты. Акрамя таго, у сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі ёсць спецыяльнасці, на якія прымаюць увогуле па конкурсе атэстатаў.

**Нагадваем тэлефон гарачай лініі Дзяржаўнай камісіі: 227-66-80.**

У любым выпадку спецыялісты гарачай лініі спрабуюць адказаць на ўсе пытанні і зняць напружанне.

***— Ірына Яўгенаўна, ці бывае, што прэтэнзіі вашых абанентаў выклікаюць толькі неўразуменне і здзіўленне?***

— Бывае. Напрыклад, як вы ведаеце, для паступлення на шэраг спецыяльнасцей абітурыентам неабходна праходзіць прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне. Яно ўжо традыцыйна арганізоўваецца ў красавіку. Натуральна, вельмі здзівілі людзі, якія тэлефанавалі на гарачую лінію і пыталіся, ці магчыма персанальна для іх стварыць камісію і правесці субяседаванне ў ліпені, не маючы на тое важкіх прычын.

Не перастаю здзіўляцца, калі абітурыенты кажуць, што "забылі зарэгістравацца на цэнтралізаванае тэсціраванне". Мне здаецца, паступленне ў ВНУ — гэта адзін з самых важных момантаў у жыцці, да якога трэба рыхтавацца, калі хочаце, некалькі гадоў. А некаторыя праходзяць цэнтралізаванае тэсціраванне па такіх прадметах, з якімі ўвогуле нельга паступіць ні на адну спецыяльнасць.

Яшчэ даволі распаўсюджаны выпадак, калі ў момант цэнтралізаванага тэсціравання пашпарт удзельніка знаходзіцца ў консульстве на афармленні візы. Важна вызначыць прыярытэты. Што больш важна: павандраваць за мяжой ці паступіць у ВНУ? На мой погляд, адпачыць можна пасля паступлення.

***— На што вы звярнулі б увагу абітурыентаў на бягучым этапе ўступнай кампаніі?***

— Канечне, раю яшчэ раз уважліва пагартаць Правілы прыёму, іншыя нарматыўныя дакументы, звярнуць увагу на тэрміны прыёму дакументаў на платнае навучанне ў ВНУ, а таксама на бюджэт і платную форму ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Рэкамендую ўважліва паглядзець на пералік дакументаў, якія трэба падаваць у прыёмную камісію, праверыць іх якасць, адпаведнасць патрабаванням, асабліва калі абітурыент мае права на льготы.

Навучальныя ўстановы сёння прадастаўляюць максімальна поўную, усебаковую інфармацыю, якая тычыцца ўступнай кампаніі. Таму ўважліва вывучайце інфармацыйныя матэрыялы, звяртайцеся з пытаннямі ў прыёмную камісію загадзя, а не па факце ўзнікнення праблемы. Усім жадаю поспехаў!

***— Дзякуй за гутарку.***

**Іна НІКІЦЕНКА.**
**Фота аўтара.**

***Гарачая лінія Міністэрства адукацыі (222-43-12) прымае звароты па самых розных пытаннях: ад уладкавання дзяцей у дзіцячыя садкі да прызнання дыпломаў ВНУ. Але па-сапраўднаму гарачая тэма зараз — гэта, канечне, уступная кампанія.***



## Дзяжурны па гарачай лініі Міністэрства адукацыі:

# "Мы кансультуем, а не вырашаем невырашальныя праблемы"

У распараджэнні дзяжурнага па гарачай лініі Сяргея Алейніка, загадчыка кафедры ўсходніх моў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта (дарэчы, Сяргей Яўгенавіч некалькі гадоў працаваў адказным сакратаром гэтай ВНУ), цэлы стос даведачнай літаратуры і нарматыўнай дакументацыі.

"У апошнія дні, паколькі зараз ідзе этап апрацоўкі дакументаў і залічэння, пераважаюць пытанні аб раздзельным конкурсе сярод гарадскіх і сельскіх абітурыентаў, аб умовах і тэрмінах прыёму на платную форму навучання, аб паступленні на завочную бюджэтную форму", — расказвае спецыяліст.

Дарэчы, у гэтым годзе ўпершыню дакладна вызначаны профілі спецыяльнасцей для паступлення ў ВНУ на завочнае бюджэтнае навучанне. Адпаведны ліст Міністэрства адукацыі займае каля 135 старонак (!). Гэты дакумент маецца ў прыёмнай камісіі кожнай ВНУ, але многія будучыя завочнікі імкнуцца перадўдакладніць гэтую інфармацыю ў міністэрстве.

Па словах С.Я.Алейніка, большасць зваротаў мае ўдакладняльны, дзелавы характар, і часам абаненты ўражваюць сваёй дасведчанасцю, тым не менш сустракаюцца і вельмі эмацыянальныя званкі. Так, заўчора, падчас нашага інтэрв'ю, на гарачую лінію патэлефанавала маці абітурыента аднаго з медыцынскіх універсітэтаў і вельмі абуралася тым, што ўніверсітэт дагэтуль не абнародаваў канчатковую інфармацыю аб пададзеных заявах і трымае абітурыентаў і іх сем'і ў напружаным, нервовым стане.

"ВНУ не абавязаны гэтага рабіць. Некаторыя ўніверсітэты друкуюць гэтую інфармацыю, але хутчэй у іміджавых мэтах, — патлумачыў маці Сяргей Яўгенавіч. — Паводле Правіл прыёму, залічэнне на бюджэтнае навучанне павінна адбыцца не пазней чым 1 жніўня, і ВНУ выкарыстоўваюць гэты тыдзень на тое, каб падлічыць і пераправерыць уступную статыстыку, выключыць усе магчымыя памылкі".

Варта падкрэсліць, што тэлефанаваць на гарачую лінію ёсць сэнс, калі патрабуецца кансультацыя. Тут вам раскажуць аб вашых магчымасцях, але не абяцаюць вырашыць невырашальныя праблемы, паколькі вымушаны дзейнічаць у межах абавязковай для ўсіх нарматыўнай базы. Так, Міністэрства адукацыі не можа дапамагчы абітурыентам, якія па тых ці іншых прычынах не паспелі падаць дакументы своечасова. Таксама вельмі шкада маладых людзей, якія прапусцілі іспыты ў ВНУ па прычыне хваробы, — перанос экзаменаў заканадаўствам не прадугледжаны.

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*

# Прахадныя балы ў БДУІР аказаліся на трэць вышэйшымі, чым у мінулыя гады



***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі працягвае эксперымент па ўкараненні аўтаматызаванай сістэмы залічэння абітурыентаў. Летась сістэму адпрацавалі на платнай форме навучання, а сёлета яна запушчана і на бюджэтнай форме. Паводле задумы, новы падыход павінен гарантаваць паступленне найбольш падрыхтаваных абітурыентаў з улікам іх запытаў.***
***Пра тое, як працуе аўтаматызаваная сістэма залічэння ў асобнай ВНУ і калі магчыма яе ўкараненне ў межах усёй краіны, мы папрасілі расказаць аднаго з распрацоўшчыкаў сістэмы прарэктара па вучэбнай рабоце і інфарматызацыі БДУІР Барыса Віктаравіча НІКУЛЬШЫНА.***

***— Вынікі залічэння на дзённую бюджэтную форму навучання ў БДУІР, як і ў іншых ВНУ, будуць абвешчаны толькі ў суботу. Скажыце, Барыс Віктаравіч, хіба аўтаматызаваная сістэма не дазваляе вам правесці працэдуру залічэння ў больш сціслыя тэрміны?***

— Фармальна мы правялі залічэнне яшчэ ў той жа дзень, як завяршылі прыём дакументаў, але афіцыйна вынікі вырашылі абвясціць 30 ліпеня, у суботу. Справа ў тым, што папярэдне мы ўсё пільна пераправяраем, асабліва дакументы, якія пацвярджаюць абітурыенцкія льготы, права ўдзельнічаць у сельскім конкурсе і г.д. Памылак тут быць не павінна.

***— Раскажыце, як ажыццяўлялася залічэнне з тэхнічнага пункта гледжання.***

— Пры падачы дакументаў нашы абітурыенты ўказалі дзве або тры спецыяльнасці, на якія яны хацелі б паступіць, расставіўшы іх па прыярытэце. Мы аб'ядналі гэтую інфармацыю з той, якая захоўваецца ў агульнарэспубліканскай базе даных, сфарміраванай пры рэгістрацыі на ЦТ, і пасля завяршэння прыёму дакументаў запусцілі праграму залічэння.

З ліку тых, хто падаў дакументы на бюджэтную форму навучання, адпаведна плана прыёму ва ўніверсітэт былі адабраны 1013 лепшых абітурыентаў на тэхніка-тэхналагічны профіль і 27 — на эканамічны. Абітурыентам, якія ўвайшлі ў гэты лік, ужо гарантавана бюджэтнае месца, а далей адбываецца іх размеркаванне па спецыяльнасцях: спачатку праводзіцца конкурс па першым прыярытэце, затым па другім і трэцім (абітурыенты тэхніка-тэхналагічнага профілю ўказвалі тры спецыяльнасці, а абітурыенты эканамічнага профілю — дзве).

Унікальнасць сістэмы заключаецца ў тым, што лепшым абітурыентам, нават калі яны "памыліліся" ў выбары спецыяльнасці, гарантавана паступленне. Той, хто вытрымаў універсітэцкі конкурс, але пры гэтым не прайшоў па конкурсе ні на адну з указаных у заяве спецыяльнасцей, па рашэнні прыёмнай камісіі будзе залічаны на іншую спецыяльнасць у рамках профілю.

***— Вы ўжо можаце сказаць, які прахадны бал быў на тэхніка-тэхналагічным і эканамічным профілях?***

— Мы не хацелі б агучваць гэтыя лічбы да таго, як пройдзе афіцыйнае залічэнне, але ўжо можна сказаць, што сёлета прахадныя балы аказаліся на трэць вышэйшымі, чым у мінулыя гады. Колькасць заяў на дзённую форму навучання таксама значна перавысіла папярэднія паказчыкі.

***— А вы можаце назваць лічбу, як многа абітурыентаў не паступілі ні на адну з выбраных спецыяльнасцей і зараз атрымаюць прапанову быць залічанымі на іншую спецыяльнасць, пра якую яны, можа, і не думалі?***

— Такіх каля 150 чалавек. Але заўважце: амаль 900 абітурыентаў паступілі менавіта на тыя спецыяльнасці, на якія хацелі.

***— Скажыце, калі частка людзей, якім прапанавана іншая спецыяльнасць, адмовяцца ад залічэння і захочуць паступаць на прыярытэтныя спецыяльнасці на ўмовах аплаты, хто зможа прэтэндаваць на вызваленыя месцы?***

— Зразумела, гэта тыя абітурыенты, якія першапачаткова не прайшлі ўніверсітэцкі конкурс з найменшым адставаннем у балах. І мы мяркуем, што адмовы на залічэнне будуць, бо заўсёды знойдуцца ўпартыя абітурыенты, якія выбіраюць пэўную спецыяльнасць і не жадаюць ніякіх кампрамісаў. Аднак мы ўсё ж раілі б людзям не адмаўляцца ад бюджэтнага навучання, бо пасля 1 курса ў іх будзе магчымасць перавесціся з адной спецыяльнасці на другую. Хаця практыка паказвае, што студэнты рэдка карыстаюцца такой магчымасцю. Спецыяльнасці ў нас усе цікавыя, праграмаванне вывучаецца ўсюды, прычым на высокім узроўні, і ў той жа Парк высокіх тэхналогій можа пайсці працаваць любы наш выпускнік. Таму каля 90% студэнтаў, якія паступілі "не на тую" спецыяльнасць, на якую першапачаткова імкнуліся, нікуды ўжо не пераводзяцца.

***— Калі толькі абмяркоўваліся перспектывы электроннага залічэння, ішла размова пра тое, што трэба ўпарадкоўваць або ўвогуле здымаць шматлікія льготы пры паступленні. Аднак ужо і залічэнне прайшло, а льготы засталіся. Ці сутыкнуліся вы ў сувязі з гэтым з нейкімі праблемамі?***

— Так, толькі гэта праблемы не тэхнічнага, а арганізацыйнага плана. Ільгот, сапраўды, многа, але цяжкасці звязаны не з тым, каб забяспечыць іх выкарыстанне пры залічэнні, а з іх дакументальным пацвярджэннем. Справа ў тым, што дакументы, якія пацвярджаюць ільготы, вельмі пярэстыя, адзінай формы няма, і часта бываюць складанасці з іх уніфікацыяй.

Таксама мы бачым праблему ў тым, што на шэраг спецыяльнасцей прахадны бал сельскіх выпускнікоў удвая меншы, чым гарадскіх. Відавочна, што гэта трэба спыняць, бо, па-першае, такія людзі не змогуць вучыцца ва ўніверсітэце, а па-другое, яны выцясняюць вельмі добра падрыхтаваных абітурыентаў. Даходзіць да кур'ёзу. Напрыклад, сельскай ільготай могуць карыстацца жыхары прэстыжных мінскіх прыгарадаў. Яны жывуць фактычна ў курортнай зоне, але маюць істотную перавагу перад гарадскімі равеснікамі.

Бацькі абітурыентаў з вельмі высокімі баламі, якія пры гэтым застаюцца за бортам, бачаць, з якой падрыхтоўкай залічваюцца сельскія выпускнікі, і не могуць зразумець, у чым тут сацыяльная справядлівасць. Сёлета прахадныя балы сельскіх абітурыентаў на шэрагу спецыяльнасцей выглядаюць вельмі непрываблівa, таму мы лічам, што ўсё ж галоўным крытэрыем пры паступленні павінны быць веды.

Хачу сказаць, што асноўнымі распрацоўшчыкамі аўтаматызаванай сістэмы залічэння з'яўляюцца маладыя людзі да 30 гадоў. Гэта ультрапраграмісты, якія да таго ж маюць жывы і смелы погляд на свет, і іх меркаванне па многіх пытаннях заслугоўвае ўвагі.

Напрыклад, сёння пры паступленні ў ВНУ патрэбны медыцынскія даведкі. Падчас уступнай кампаніі яны адцягваюць шмат увагі і абітурыентаў, і паліклінік, і нашых службаў. Ёсць нават жарт: здаровых людзей няма, а ёсць неабследаваныя, і, магчыма, у кожнага ёсць нейкія праблемы. Але маладыя людзі жывуць актыўным жыццём, рухаюцца, развіваюцца і з часам могуць выправіць дэфект здароўя, калі ён ёсць (зрэшты, як і набыць новы). Гэта жыццё! А ўрачы пачынаюць узводзіць нейкія перашкоды ў выглядзе проціпаказанняў да той ці іншай прафесіі. Такі падыход, ва ўсякім разе да грамадзянскіх спецыяльнасцей, маральна састарэў, бо калі чалавек фізічна можа наведваць заняткі, працаваць за камп'ютарам (ніхто ж не кантралюе яго знаходжанне за камп'ютарам дома!), то навошта яму замінаць? Дарослы чалавек у стане сам паклапаціцца пра сваё здароўе.

Шмат работы нам падкідвае і школа. А наколькі прасцей было б працаваць прыёмнай камісіі, калі б у атэстатах абітурыентаў асобным радком быў пазначаны сярэдні бал! Зараз мы працуем з базай РІКВ, дзе ёсць усе асноўныя звесткі пра абітурыентаў: нумар пашпарта, адрас, адзнакі па прадметах... І ў той жа час мы марнуем вялізную колькасць часу на падлікі сярэдняга бала атэстата. У школе, дзе адзін — два выпускныя класы, гэта можна было б рабіць вельмі хутка, а мы, каб пазбегнуць памылак і шматразовых праверак, маглі б сканіраваць атэстат і ўносіць патрэбную інфармацыю ў агульную базу.

***— Як вы думаеце, Барыс Віктаравіч, у наступным годзе аўтаматызаваная сістэма залічэння можа быць задзейнічана ва ўсёй краіне?***

— Сумняваюся, бо для гэтага патрабуецца перабудова ўсёй сістэмы ўступнай кампаніі: істотны перагляд парадку паступлення, тэрмінаў прыёму дакументаў і залічэння, ільгот і г.д.

Абавязкова трэба ўніфікаваць парадкі прыёму, каб усе ВНУ працавалі ў адным ключы. Напрыклад, сёння ў нашым універсітэце праводзіцца конкурс па спецыяльнасцях, у кагосьці — па факультэце, у кагосьці — па ВНУ. Да таго ж кожны ўніверсітэт мае свае ўмовы залічэння пры паўпрахадным бале, якія таксама трэба ўніфікаваць, а лепш увогуле адмяніць. На гэты конт ёсць вельмі слушная прапанова: абітурыентаў з паўпрахадным балам браць на вучобу за кошт рэзерваў універсітэта. Усе ВНУ могуць гэта зрабіць, бо такіх людзей насамрэч няшмат, і тады адпадзе гэты доўгі пералік умоў, каму трэба аддаць перавагу пры паўпрахадным бале.

Перш чым пашыраць аўтаматызаваную сістэму залічэння, трэба вызначыць, хто будзе залічваць абітурыентаў у рамках краіны, распрацаваць нарматыўную і тэхнічную базу. Вось мы ўстанавілі праграму ў сябе ва ўніверсітэце, і яна працуе, але каб распаўсюджваць яе на ўсю краіну, трэба, каб яна адпавядала рэспубліканскім патрабаванням і па каналах сувязі, і па абароне ад несанкцыяванага доступу. Хаця, паўтару, тэхнічныя пытанні можна вырашыць даволі апаратыўна, галоўнае — разабрацца з арганізацыйнымі праблемамі, якія вырашаюцца вельмі марудна. Тут патрэбна знайсці аптымальны баланс паміж дзяржаўнымі і прыватнымі інтарэсамі.

***— Скажыце, Барыс Віктаравіч, з увядзеннем аўтаматызаванай сістэмы залічэння ці захавалася ва ўніверсітэце так званая праблема апошняга дня.***

— На жаль, адкрытая сістэма прыёму, калі абвяшчаюцца балы і конкурс абітурыентаў па спецыяльнасцях, стварае вельмі нервовую абстаноўку ў ВНУ. Абітурыенты ператвараюцца ў сапраўдных гульцоў, імкнучыся ўгадаць спецыяльнасць, куды яны паступяць са сваімі баламі. І нават калі інфармацыя аб прыёме абнаўлялася ў 18.00 (а сёлета апошняе абнаўленне было ў 15.00), то за астатні час абітурыенты ўсё пераварочваюць з ног на галаву — сітуацыя мяняецца кардынальна!

Увогуле, гэтая апошняя інфармацыя толькі дэзарыентуе людзей: яны пачынаюць мітусіцца, перападаваць дакументы, а то і ўвогуле ездзіць па ўніверсітэтах і вышукваць месца. У апошнія гадзіны прыёму дакументаў наша вуліца Петруся Броўкі была літаральна застаўлена машынамі бацькоў, нават прыходзіў міліцыянер, каб дапамаглі аднавіць праезд. Але чаго дасягнулі бацькі ў выніку ўсіх гэтых ракіровак з дакументамі? Назіраючы, што на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак вельмі высокі конкурс, яны пачалі масава забіраць дакументы і перападаваць іх на спецыяльнасці іншых факультэтаў. У выніку найвышэйшы конкурс быў створаны на факультэце камп'ютарнага праектавання, дзе за некалькі гадзін дагэтуль конкурс быў шмат ніжэйшы, чым на факультэце КСІС. Такія вось рэаліі апошняга дня.

***— Дзякуй, Барыс Віктаравіч за цікавую размову.***

**Гутарыла Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

**Сёлета Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі павялічвае колькасць месцаў на дыстанцыйнай форме і пашырае анлайн-кансультацыі для будучых IT-спецыялістаў.**

# Падрыхтоўка IT-спецыялістаў — праз інтэрнэт

Дыстанцыйная форма — папулярны ва ўсім свеце трэнд, які адлюстроўвае патрэбу людзей у бесперапыннай адукацыі. Студэнт можа знаходзіцца дома, на працы, у любым зручным для яго месцы і праз інтэрнэт атрымліваць з універсітэта вучэбныя матэрыялы, высылаць назад выкананыя заданні і пачуць водгукі і каментарыі выкладчыкаў. У адрозненне ад завочніка, які вучыцца самастойна, а задаць пытанні можа толькі два ці тры разы на год, “дыстанцыёншчык” мае пастаянны кантакт з выкладчыкамі як па электроннай пошце, так і праз механізм тэлеканферэнцый і чатаў.



“Каб займацца дыстанцыйна, патрэбен самакантроль, таму гэтую форму трэба выбіраць свядома, — гаворыць студэнт факультэта бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання БДУІР Ягор Краўчук. — Гэта дастаткова зручна, можна здаваць экзамены на працягу года. А калі атрымліваць другую вышэйшую адукацыю, то гэтая форма ўвогуле ідэальная”.

Дэкан факультэта бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання БДУІР адказны сакратар прыёмнай камісіі Васіль Міхайлавіч Бандарык паведаміў, што ў 2011 годзе ўніверсітэт вылучае даволі шмат месцаў для жадаючых вучыцца дыстанцыйна. Гэта магчымасць гнуткага графіка, зручнага для студэнта і яго работадаўцы. Нарматыўны тэрмін навучання складае 6 гадоў, але студэнт можа выбраць індывідуальны паскораны тэмп навучання і атрымаць вышэйшую адукацыю за 4 гады. Калі ў яго ўжо ёсць вышэйшая адукацыя, то ён значна сэканоміць свой час. Акрамя таго, дыстанцыйнае навучанне больш таннае, чым на дзённай форме.

З мінулага года ў вучэбным працэсе студэнтаў дыстанцыйнай формы навучання выкарыстоўваецца сучасная сістэма SharePointLMS Ru, якая спрашчае ўзаемадзеянне выкладчыка і студэнта. А сёлета ўкараняюцца тэхналогіі відэаканферэнцсувязі для арганізацыі анлайн-кансультацый, відэалекцый і інш.

БДУІР працягвае набор на дыстанцыйную форму навучання па IT-спецыяльнасцях да 4 жніўня. Пасля паспяховага заканчэння першага курса студэнт мае магчымасць працягваць навучанне дыстанцыйна або перавесціся на дзённую форму.

***

Акрамя таго, у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі ў гэтым годзе аднаўляецца вячэрняя форма навучання. Набор на яе праходзіць па васьмі найбольш запатрабаваных спецыяльнасцях.

Як паведаміў прарэктар па вучэбнай рабоце і інфарматызацыі БДУІР Б.В.Нікульшын, узнаўляючы вячэрнюю форму, універсітэт пайшоў насустрач тым, хто хоча зберагчы час і сумясціць вучобу з кар’ерай.

“Практыка паказвае, што студэнты старшых курсаў дзённай формы навучання пераважна працуюць, — гаворыць Барыс Віктаравіч, — а таму многія просяць паставіць ім заняткі, лабараторныя работы і залікі менавіта вечарам. Мы, як правіла, ідзём насустрач, тым больш што ў гэты час у нас свабодны аўдыторны фонд. А потым падумалі: чаму б увогуле не загрузіць аўдыторыі вечарам”.

Сучасная моладзь разумее, што, каб стаць добрым спецыялістам, трэба ўдзельнічаць у рэальных праектах, асабліва па інфармацыйных тэхналогіях. Таму студэнты знаходзяць усё больш пераваг у вячэрняй і дыстанцыйнай формах навучання.

**Падрыхтавала Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@nastgaz.by*

# У БДУ працягваюць эксперыментаваць з тэхнічнымі навінкамі

***Сёлета Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт працягнуў практыку відэатрансляцыі пасяджэнняў прыёмнай камісіі. Упершыню ў гэтым годзе была апрабавана магчымасць трансляцыі праз інтэрнэт. Пачынаючы з 27 ліпеня кожны дзень у 15 гадзін можна паназіраць за тым, як адбываецца залічэнне абітурыентаў на ўсе формы навучання.***

## Паслядоўная палітыка прадастаўлення камфортных электронных паслуг

Увогуле, трэба зазначыць, што Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у гэтым годзе адным з першых пачаў праводзіць залічэнне (многія ВНУ чакаюць апошняга тэрміну, прапісанага Правіламі прыёму), ды яшчэ і ў прамым эфіры.

Відэатрансляцыі можна пабачыць, напрыклад, на экране, які размешчаны ў галоўным корпусе Белдзяржуніверсітэта. Інтэрнэт-трансляцыя даступна толькі на тэрыторыі БДУ, а пры выхадзе ў знешнюю сетку пакуль ёсць тэхнічныя цяжкасці. Тым не менш адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ Вячаслаў Малафееў запэўніў, што ўніверсітэт зараз працуе над тым, каб усе карыстальнікі інтэрнэту змаглі пабачыць поўную карціну пасяджэнняў камісіі.

— Відэатрансляцыя — гэта адна з форм аператыўнага інфармавання абітурыентаў аб дзейнасці прыёмнай камісіі, механізме залічэння, — пракаменціраваў Вячаслаў Міхайлавіч. — Гэта больш эфектыўна, чым праводзіць залічэнне ў вялізных памяшканнях у прысутнасці абітурыентаў і бацькоў. Сустрэчы дэканаў факультэтаў з удзельнікамі ўступнай кампаніі прайшлі напярэдадні. А сама працэдура залічэння праходзіць у зале пасяджэння вучонага савета з удзелам рэктара БДУ, дзе разглядаецца кожная асабістая справа абітурыента. Пасля пасяджэнняў падпісваецца загад аб залічэнні, і спісы залічаных мы вывешваем на інфармацыйных стэндах.

Па словах Вячаслава Малафеева, відэатрансляцыя пасяджэнняў прыёмнай камісіі — гэта наступны крок у палітыцы адкрытасці, якую планамерна праводзіць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Акрамя таго, універсітэт будзе далей імкнуцца прадастаўляць абітурыентам камфортныя электронныя паслугі. Нагадаем, што БДУ стаў першай ВНУ, якая забяспечыла аўтаматызаваны разлік і абнаўленне на сваім сайце бягучых прахадных балаў па ўсіх спецыяльнасцях, а таксама доступ да гэтай інфармацыі праз бясплатную безправадную сетку ва ўніверсітэцкім гарадку.

Спачатку, як вядома, залічваюцца абітурыенты, якія падалі дакументы на дзённую бюджэтную форму навучання. Першымі ў графіку былі факультэты прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій, механіка-матэматычны факультэт і факультэт міжнародных адносін. Завершыцца залічэнне бюджэтнікаў дзённай формы навучання 1 жніўня. Залічэнне на завочны бюджэт адбудзецца 3 жніўня. А на ўмовах аплаты на дзённую і завочную формы навучання залічэнне пройдзе 5 і 6 жніўня.

## Прахаднымі баламі ўражваюць ФПМІ і ФМА

А вось і першыя вынікі залічэння ў Белдзяржуніверсітэт.

ФПМІ атрымаў 217 новых студэнтаў, у тым ліку 42 паступілі без уступных іспытаў і адзін па-за конкурсам. Самы высокі прахадны бал, 361, — на спецыяльнасці “Актуарная матэматыка”, затым ідуць спецыяльнасці “Камп’ютарная бяспека” (340), “Інфарматыка” (338), “Прыкладная інфарматыка” (333), “Эканамічная кібернетыка” (327), “Прыкладная матэматыка” (303).

На факультэце радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій сітуацыя выглядае такім чынам: са 198 залічаных 6 чалавек прынята без экзаменаў і 1 — па-за конкурсам. Самыя высокія прахадныя балы зарэгістраваны на спецыяльнасцях “Камп’ютарная бяспека” — 284, “Прыкладная інфарматыка” — 263, “Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі” — 254. На класічнай “Радыёфізіцы” прахадны бал — 224 і 227 (у сяльчан і гараджан адпаведна).

Механіка-матэматычны факультэт таксама атрымаў першакурснікаў з вельмі добрай падрыхтоўкай. Тут залічаны 192 абітурыенты. На “Матэматыку” са спецыялізацыяй “Web-праграмаванне і internet-тэхналогіі” прахадны бал дасягнуў 300. Крыху ніжэйшыя прахадныя балы на спецыялізацыю “Камп’ютарная матэматыка” (296) і напрамак “Эканамічная дзейнасць” (282). На спецыяльнасць “Механіка” (спецыялізацыя “Камп’ютарная механіка”) паступілі абітурыенты з балам, не ніжэй за 260.

На факультэт міжнародных адносін залічана 95 чалавек, у тым ліку 14 — без экзаменаў і 1 — па-за конкурсам. На шэраг спецыяльнасцей нават склаўся конкурс звыш 4 чалавек на месца. На спецыяльнасці “Міжнароднае права” прахадны бал сярод гараджан склаў 369, а сярод сяльчан — 290. Планку ў 307 і 360 балаў прыйшлося пераадолець сельскім і гарадскім абітурыентам (адпаведна) спецыяльнасці “Лінгвакраіназнаўства”. На “Міжнародныя адносіны” паступілі абітурыенты з баламі 343 і 359 (сяло і горад). Менавіта тут самы высокі конкурс — 4,1 заявы на месца. На спецыяльнасці “Менеджмент” (са спецыялізацыяй “Менеджмент у сферы міжнароднага турызму”) і “Сусветная эканоміка” праводзіўся аб’яднаны конкурс, а прахадныя балы склалі 345 і 363 адпаведна. І ўрэшце, каб паступіць на “Мытную справу”, трэба было мець не менш за 319 балаў сяльчанам і 338 — гараджанам.

Філалагічны факультэт папоўніўся 75 першакурснікамі, трое з якіх залічаны без экзаменаў і 10 — па-за конкурсам. Самыя высокія прахадныя балы тут зарэгістраваны на спецыяльнасцях “Усходняя (кітайская) філалогія” — 310, а таксама “Рамана-германская (італьянская) філалогія” — 321 (сярод гараджан).

**Падрыхтавала Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**



Настаўніцкая газета
30 ліпеня 2011 года

***Сёння з дзесяці гадзін да паловы пятай праходзіць залічэнне студэнтаў на дзённую форму навучання за кошт сродкаў бюджэту ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Гэтая ВНУ адной з першых у краіне стала практыкаваць адкрытае залічэнне ў прысутнасці абітурыентаў і іх бацькоў і застаецца вернай гэтай традыцыі ўжо шмат гадоў.***

# Сплаў мастацтва, навукі і рамяства

## *Пра некаторыя ўрачэбныя таямніцы*



Пры цяперашняй сістэме прыёму цяжка ацаніць сапраўдны конкурс, але па балах, прадстаўленых абітурыентамі ў прыёмную камісію, можна меркаваць, што попыт на медыцынскую адукацыю, як заўсёды, высокі. Паводле папярэдняй інфармацыі, на бюджэтную форму навучання падалі дакументы 34 чалавекі, якія маюць права залічвацца без уступных іспытаў (на ваенна-медыцынскі факультэт — 1, на лячэбны — 19, на фармацэўтычны — 6, на педыятрычны — 1, на стаматалагічны — 7).

Адметна, што 6 чалавек, якія маглі б быць залічаны без уступных іспытаў на бюджэтную форму, адразу падалі дакументы на платнае навучанне (3 чалавекі — на лячэбны факультэт, 2 — на педыятрычны і 1 — на стаматалагічны). Відавочна, у гэтых людзей свае планы на будучыню і яны загадзя паклапаціліся аб тым, каб не працаваць па размеркаванні.

"Кошт платнага навучання ў нашым універсітэце высокі, — гаворыць першы прарэктар БДМУ прафесар Сяргей Дзмітрыевіч Дзяніcаў, — і тэндэнцыі развіцця сусветнай эканомікі не абяцаюць яго змяншэння ў будучыні. Таму, прымаючы рашэнне вучыцца за аплату, абітурыентам неабходна ўлічыць адсутнасць стыпендыі і значныя выдаткі на пражыванне (інтэрнат прадастаўляецца ў першую чаргу студэнтам бюджэтнай формы навучання), а таксама доўгі тэрмін навучання".

Аднак студэнты, якія вучацца за аплату, маюць і некаторыя перавагі перад бюджэтнікамі. Так, платнікі могуць пры неабходнасці лёгка змяніць месца працы (бюджэтнікі ж у выпадку нязгоды з размеркаваннем абавязаны выплаціць увесь кошт навучання (уключаючы стыпендыю).

У студэнтаў ёсць магчымасць атрымання льготнага крэдыту для аплаты навучання, дзейнічае таксама сістэма скідак у аплаце. А самыя здольныя платнікі могуць быць пераведзены на бюджэтнае навучанне.

"Сёлета толькі на лячэбным факультэце на такі перавод прэтэндуюць як мінімум 8 студэнтаў, — гаворыць Сяргей Дзмітрыевіч. — Але трэба разумець, што гэта сапраўды выбітныя людзі — выдатнікі вучобы (75% адзнак — дзявяткі і дзясяткі), аўтары пацверджаных навуковых работ і грамадскія актывісты! Прычым значэнне мае не тое, з'яўляецца прэтэндэнт членам якой-небудзь грамадскай арганізацыі ці не, а ўлічваюцца рэальныя справы, напрыклад, дапамога хворым у бальніцах і хоспісах".

Трэба сказаць, што ўніверсітэт ужо абвясціў кошт за навучанне на будучы год, пастараўшыся павысіць яго мінімальна, бо медыцынская адукацыя і без таго самая дарагая. "Справа ў тым, што каля 85% кошту складае фонд заработнай платы, — тлумачыць першы прарэктар, — а значыць, чым меншыя групы, тым большыя выдаткі на падрыхтоўку. І калі іншыя ВНУ могуць мець групы па 30 чалавек, то ў медыцынскім універсітэце — групы па 5—6 чалавек. Адсюль павінна быць зразумела, чаму самае дарагое навучанне на стаматалагічным факультэце — не з-за таго, што матэрыялы дарагія, як многія думаюць, а з-за таго, што там вельмі маленькія групы, бо глядзець пацыенту ў рот адначасова семярым немагчыма!"

Аплата за навучанне адбываецца ў два этапы: у верасні і студзені. Часам, пры наяўнасці апраўдальных дакументаў, можна атрымаць кароткую адтэрміноўку плацяжу — гэта вырашае спецыяльная камісія. Дарэчы, калі яшчэ толькі пачыналася платнае навучанне, натуральна, хутка паявіліся людзі, якія ў нейкі момант не маглі плаціць за вучобу. Калі ў такой сітуацыі аказваліся студэнты першага курса, то гэта яшчэ не было катастрофай: яны адлічваліся даволі спакойна. Але калі плаціць за вучобу не маглі старшакурснікі, то гэта сапраўды стала праблемай. Мала таго, што бацькі ўжо заплацілі велізарныя грошы за некалькі гадоў, дык з гэтага яшчэ нічога добрага не атрымалася. На той час яшчэ не было правіл, каб даваць студэнту акадэмічны водпуск з-за немагчымасці плаціць, і медыцынскі ўніверсітэт быў першым, хто пачаў гэта рабіць. Студэнту даваўся цэлы год, каб ён зарабіў грошай і вярнуўся прадоўжыць вучобу.

**Дарэчы**

**Залічэнне абітурыентаў у ВНУ на платнае навучанне ажыццяўляецца на падставе заключанага дагавора, а таму прысутнасць абітурыентаў і іх законных прадстаўнікоў на адкрытым залічэнні абавязковая. У выпадку адсутнасці па ўважлівай прычыне абітурыенту неабходна загадзя папярэдзіць прыёмную камісію, у адваротным выпадку дагавор на навучанне будзе заключаны з абітурыентам, наступным па чарзе.**

"Добрая адукацыя не бывае лёгкай, — гаворыць Сяргей Дзмітрыевіч. — Я неаднаразова бываў у ЗША і бачыў, што ва ўніверсітэце ў 2 гадзіны ночы гарыць святло і студэнты вучацца. Таму трэба правільна разлічваць не толькі свае грошы, але і свае сілы, каб іх хапала на вучобу. Гэта час не раскідваць, а збіраць камяні! У нас вучыцца шмат здольных людзей, таленавітых інтэлектуалаў. І справа нават не ў тым, што яны прыйшлі сюды з высокімі прахаднымі баламі. Галоўнае — здольнасць да прафесіі, без якой вучыцца ў медыцынскай ВНУ надзвычай складана".

Што да формы ўступных іспытаў, то Сяргей Дзмітрыевіч упэўнены: яна не мае прынцыповага значэння. "Сёння мы адбіраем студэнтаў па выніках трох іспытаў, — гаворыць ён, — але ж медыцына — гэта не мова, не хімія і нават не біялогія! Медыцына — гэта сплаў мастацтва, навукі і рамяства. Таму тэсты — толькі ўмоўныя крытэрыі для адбору, хаця ў цэлым яны нас задавальняюць, бо даюць максімальную аб'ектыўнасць: у адзін і той жа час абітурыенты выконваюць адны і тыя ж заданні, а значыць, іх лёгка ранжыраваць па ўзроўні падрыхтоўкі. Наша ж задача — выхоўваць тых, хто сюды прыходзіць, і вучыць іх складанай медыцынскай навуцы".

Зараз пры паступленні ў медыцынскі ўніверсітэт многія льготы ўжо не дзейнічаюць, а вось некалькі гадоў назад сітуацыя з ільготамі была сапраўды катастрафічнай. Ужо было ўведзена цэнтралізаванае тэсціраванне, але адначасова захоўвалася тая ж норма, што і пры звычайнай экзаменацыі: дзеці-сіроты і яшчэ шэраг катэгорый грамадзян пры ўмове станоўчай здачы ўступных іспытаў залічваліся ва ўніверсітэт па-за конкурсам. Але калі традыцыйныя экзамены дрэнна падрыхтаваныя абітурыенты не маглі здаць, то сертыфікаты ЦТ атрымлівалі ўсе! І тады абітурыенты, якія мелі права на пазаконкурснае залічэнне, масава пайшлі ў медыцынскія ВНУ.

"Мы спрабавалі перакананы гэтых дзяцей і іх апекуноў не паступаць да нас з вельмі нізкімі баламі, але, на жаль, нам гэта не ўдавалася, — успамінае Сяргей Дзмітрыевіч. — У выніку вельмі многія добра падрыхтаваныя абітурыенты засталіся за бортам, а тыя, хто паступіў не па ведах, а па льготах, так і не здолелі правучыцца ва ўніверсітэце больш за год. Таму мы і зараз просім абітурыентаў, нават здольных плаціць за вучобу, уважліва ўзважыць свае магчымасці, бо медыцынская адукацыя патрабуе вялікіх інтэлектуальных высілкаў. І ставіцца да яе трэба з розумам".

Адметна, што ў медыцынскіх ВНУ дагэтуль захавалася мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў, якая ажыццяўляецца ў межах зацверджаных кантрольных лічбаў прыёму. Часам, на жаль, каб паступіць ва ўніверсітэт, абітурыенты шукаюць самыя розныя шляхі і гатовы падпісаць любую паперу. Бывае, што мэтавае накіраванне бяруць людзі, якія і без таго паступілі б ва ўніверсітэт, бо маюць дастаткова высокія балы. А варта было б спыніцца і прааналізаваць сітуацыю, перш чым звязваць сябе мэтавым дагаворам.

**Дарэчы**

**Пры наяўнасці ва ўстанове адукацыі вакантных мэтавых месцаў на іх могуць быць пераведзены асобы, якія вучацца па той жа або роднаснай спецыяльнасці, у тым ліку і на платных формах навучання, у гэтай ці іншай установе адукацыі.**

Таму абітурыентам трэба тлумачыць, што мэтавае накіраванне, акрамя таго, што спрашчае паступленне, абавязвае чалавека пасля заканчэння ўніверсітэта накіравацца на пяцігадовую адпрацоўку. Але ці можна загадзя меркаваць, як складуцца сямейныя абставіны праз шэсць гадоў, якія прафесійныя і навуковыя інтарэсы паявяцца за гады вучобы і ці будзе магчымасць рэалізаваць іх на прапанаваным месцы працы. Таму думаць трэба не пра паступленне сёння, а пра жыццё ў будучыні. Хаця як растлумачыць гэта сямнаццацігадовым людзям, якія мараць пра медыцынскую адукацыю?!

**Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@nastgaz.by*

**Сёлетняе цэнтралізаванае тэсціраванне прайшло надзвычай спакойна і, калі шчыра, то для нас, журналістаў, сумна. Не было ні эмацыянальных тэлефанаванняў, ні ўзрушаных пісьмаў з пытаннямі, абурэннямі, прапановамі, як гэта было ў папярэднія гады. Таму задумка правесці гарачую лінію па пытаннях ЦТ у пэўны момант падалася нам неактуальнай: цэнтралізаванае тэсціраванне ператварылася ў стандартную працэдуру, чые правілы празрыстыя, дакладныя і зразумелыя.**

# ЦТ слязам не верыць

## *Непрадузяты погляд*

А колькі было жарсцяў напачатку! Сказаць, што ЦТ нараджалася ў пакутах — гэта значыць, нічога не сказаць. ЦТ нараджалася пад плач бацькоўскіх істэрык, стогн настаўнікаў і рэпетытараў і гул усеагульнага недаверу.

Трэба аддаць належнае кіраўніцтву і супрацоўнікам міністэрства адукацыі, дырэктару РІКВ Мікалаю Сцяпанавічу Фяськову, якія вельмі цярпліва тлумачылі людзям сутнасць ЦТ. І рабілі гэта некалькі гадоў запар! Так, іх падтрымлівала частка педагагічнай грамадскасці, але пры гэтым бесперапынна атакавалі СМІ, прычым як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя, бацькі, а яшчэ горш — вопытныя педагогі, якія павінны былі бачыць на перспектыву, але не бачылі... Ціск грамадства быў сапраўды беспрэцэдэнтным, і, думаю, далёка не кожны справіўся б з такой нагрузкай. А міністэрства і РІКВ упарта і дзелавіта рабілі сваю справу: стварылі сістэму, якая будзе дзейнічаць, як швейцарскі гадзіннік. І сёння гэтай сістэме ўжо давяраюць абітурыенты, бацькі, ВНУ, дзяржава.




Нам у газеце было цікава назіраць, як мянялася крытыка ў адрас ЦТ колькасна і якасна: ад татальнага непрыняцця ў першыя гады праз частковае разуменне да дробязных прыдзірак. Помню, як мама абітурыента вельмі сур'ёзна абуралася: "Гэта ж трэба, прыдумалі тры этапы рэпетыцыйнага тэсціравання! Навошта! Каму гэта патрэбна? Хаця б два... Але ж тры!" Аргументы кшталту "не трэба вам — не хадзіце!" дзейнічалі слаба. Дрэнна прыдумалі і ўсё тут! А нядаўна мы атрымалі ліст, дзе вельмі падрабязна і крытычна аналізуюцца тэсты... 2008 года. "Не адпавядаюць школьнай праграме!" — піша аўтар. Як кажуць, без каментарыяў.

Дзеці ж, як правіла, не маюць прывычкі загадзя і дарэмна хвалявацца, таму пакуль бацькі і настаўнікі ламалі коп'і ў барацьбе з сучаснымі тэхналогіямі, яны старанна рыхтаваліся да паступлення. Але некаторым абітурыентам усё роўна папала: дарослыя каламуцілі ваду і ўцягвалі ў гэтую справу сваіх дзяцей. Я помню праграму "Выбар", здаецца, гэта быў 2003 год. Дзяўчынкі-выпускніцы vs Мікалай Сцяпанавіч Фяськоў! Здавалася б, яны, такія маладыя і разумныя, павінны больш, чым дарослы чалавек, цягнуцца да новага, хаця б праяўляць элементарную цікавасць... Але яны паўтаралі завучаныя за кімсьці фразы, што "з іх хочуць зрабіць ідыётаў"...

Я ведаю, як мінімум, некалькі прыкладаў, калі мае равеснікі (мы паступалі ў 1990-х) банальна і прыкра выцягнулі "не той" білет. Паступаючы ва ўніверсітэт, я бліскуча здала рускую мову і літаратуру, у мяне нават спыталі, якую школу я заканчвала і хто мой настаўнік. Але сітуацыя магла б быць дыяметральна процілеглай, калі б замест маіх любімых Гогаля і Грыбаедава я выцягнула Чарнышэўскага, якога не надта разумела, ці Талстога, якога прапусціла па хваробе, а таму не прачытала "вайну", а толькі "мір".

ЦТ засцерагае людзей ад выпадковасцей! Ну не ведаеце вы штосьці — не страшна, бо, калі вы ведаеце ўсё астатняе, гэта не пашкодзіць вам атрымаць высокі бал.

Абітурыентка Кацярына, якая сёлета здавала гісторыю Беларусі, шчыра абуралася: як гэта ў гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны не было ніводнага пытання пра Брэсцкую крэпасць! І сапраўды, тут камп'ютарная праграма, якая з тысяч заданняў фарміруе тэст, несумненна, дала ідэалагічны збой. А раней мы ведалі: калі гадавіна перамогі або юбілейны год класіка, то на сачыненні абавязкова трапіцца адпаведная тэма і рыхтавацца было прасцей.

Увогуле, цэнтралізаванае тэсціраванне пазбавіла шансаў тых, хто прывык браць не ведамі, а крамаўствам. Памятаю, калі мы паступалі, з намі разам здаваў экзамены абітурыент Ваня. Ён расказваў, што нядаўна вярнуўся з Афганістана, таму мы ўсе адчувалі да яго шчырую спагаду і стараліся ўсяляк дапамагаць. Калі Ваня садзіўся перад экзаменатарам, то адразу пачынаў з таго, што ён не паспеў як след падрыхтавацца, бо нядаўна прыйшоў з Афгана... Ці трэба казаць, што адчувалі ў той час выкладчыкі! Натуральна, чалавечнасць брала верх над прафесіяналізмам — Ваня са станоўчай адзнакай выходзіў з аўдыторыі.

Зразумела, ён вытрымаў конкурс і паступіў на журфак. На дварэ стаяў 1990 год, Афганістан быў свежай ранай, і ў БДУ дзейнічала грамадскае аб'яднанне воінаў-інтэрнацыяналістаў. Былыя салдаты даведаліся пра Івана і зайшлі ў нашу групу, каб пазнаёміцца. Іх размова адбывалася на вачах усёй групы, і тут аказалася, што нідзе наш Ваня не служыў! Чужы боль і страх ён бессаромна абмяняў на паступленне ва ўніверсітэт. Хаця дзеля справядлівасці трэба сказаць, што ў той жа дзень ён быў адлічаны.

Я ўзгадала гэтую гісторыю, каб падкрэсліць непрадузятасць ЦТ. Ні кароткая спадніца, ні экстравагантныя татуаж, ні "разумныя" акуляры не ў стане паўплываць на вынік. Толькі чыстыя веды, памножаныя на хуткасць мыслення!

Год назад мы праводзілі гарачую лінію па пытаннях цэнтралізаванага тэсціравання, і ў шэрагу тэлефанаванняў выдзяляўся адзін званок з аддаленай вёскі Мінскай вобласці. Тэлефанавалі настаўнікі не з пытаннем і не з нараканнем, а з удзячнасцю за ЦТ, якое, прадаставіўшы роўныя ўмовы для ўсіх, дазволіла вясковым дзецям масава паступаць у ВНУ. Ад нечаканасці Мікалай Сцяпанавіч Фяськоў (напэўна, упершыню за гады існавання ЦТ) не ведаў, што адказаць, але быў сапраўды крануты. Напэўна, такія званкі, сапраўды, рэдкасць. І дзіўная атрымліваецца рэч: калі ЦТ крытыкавалі, то не саромеліся тэлефанаваць і пісаць, а калі зразумелі і прынялі, то пачалі ўспрымаць яго як належнае, быццам яно было заўсёды.

Але паспрабуйце толькі ўявіць, што з наступнага года, напрыклад, будзе адменена ЦТ і ўступныя экзамены будуць праводзіцца ў ранейшым фармаце. Вы жадаеце гэтага сваім дзецям? Я таксама не жадаю.

Хаця трэба сказаць, што ЦТ і сёння крытыкуюць, асабліва за сярэднія балы па прадметах. Абнародавалі вынікі ЦТ па мовах, і адразу шум: сярэдні бал па беларускай мове 31,11, па рускай — 30,48. Матэматыка — кашмар! Фізіка — жах! І адразу пачаўся пошук вінаватых: школа, праграмы, тэсты, дзеці...

Мне насамрэч не зразумела, навошта ўвогуле абнародаваць сярэднія балы па прадметах, калі яны толькі каламуцяць людзей, не даючы пры гэтым ніякай талковай інфармацыі. Ну што з таго, што сярэднегадавая тэмпература паветра ў Мінску 5,5 градуса?! А як жа зімовыя маразы? А летняя спякота? Кіравацца сярэднестатыстычнымі данымі можа быць небяспечна.

Канечне, грамадства патрабуе сярэдні бал і атрымлівае адпаведную інфармацыю. Толькі што гэты бал паказвае, калі на бюджэтнае навучанне ў ВНУ можа прэтэндаваць не больш як 17% удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання?! Тое, што сёння ЦТ здаюць усе, хто пра яго чуў? Бо якім розумам трэба валодаць, каб здаць ЦТ па роднай мове ці па гісторыі Беларусі на 0 балаў (а па матэматыцы нулявых вынікаў увогуле 490)?! Прычым гэта не проста невукі, якія заўсёды былі, але, прынамсі, разумелі сваё месца. Сённяшнія нулявікі (а ёсць жа і двоечнікі, троечнікі...) мецяць у ВНУ. Што ж, давайце прызнаем, што гэта іх правы, але забудзем тады і пра сярэдні бал.

Што да тых 17% абітурыентаў, якія могуць прэтэндаваць на бюджэтнае навучанне, то іх балы выглядаюць вельмі прыстойна. Сёння завяршыцца залічэнне ў дзяржаўных ВНУ, і мы ўбачым, што на многія спецыяльнасці прахадны бал будзе больш за 300, а на




Класічная мадэль разліку тэставага бала, распрацаваная дацкім матэматыкам Георгам Рашам. Выгравіравана перад уваходам у РІКВ.

некаторыя можа перавысіць 360. Сярэдні бал, што называецца, і побач не стаяў.

Ёсць і іншыя тэмы, якія час ад часу ўзнімаюцца ў СМІ, напрыклад, колькасць стабальнікаў (мала!) ці колькасць нулявых вынікаў (многа!). Але гэта размовы з той жа серыі, што і пра надвор'е: экстрэмальна нізкія і экстрэмальна высокія тэмпературы дрэнна ўплываюць на навакольнае асяроддзе...

На шчасце, плынь пытанняў наконт цэнтралізаванага тэсціравання спакваля вычэрпваецца, і ўжо відавочна: ЦТ стала часткай грамадскага жыцця. Настаў час, калі цікавасць да яго праяўляюць толькі абітурыенты, і гэта цікавасць ужо будзённая, нязмушаная. Балазе ўся інфармацыя ёсць у інтэрнэце, а калі ўспрымаеш яе спакойным розумам, то ўсё становіцца зразумела і зусім не страшна.

РІКВ жа не стаіць на месцы: развіваецца сам і прымушае рухацца іншых. З самага пачатку інстытут зрабіў стаўку на выкарыстанне новых тэхналогій на ўсіх этапах падрыхтоўкі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання (мы неаднаразова і падрабязна апісвалі розныя працэсы, таму не будзем зараз паўтарацца). Адзінае, заўважым, што дэбют многіх бацькоў у інтэрнэце адбыўся менавіта тады, калі трэба было тэрмінова даведацца вынікі тэстаў сваіх дзяцей.

Электронную сістэму рэгістрацыі на ЦТ інстытут распрацаваў і ўкараніў літаральна за некалькі гадоў. Напрыклад, сістэма аўтобусных перавозак існуе ў краіне многія дзесяцігоддзі, а набыць загадзя ў Мінску білет, скажам, з Магілёва ў Бабруйск, дагэтуль немагчыма. У электроннай жа сістэме рэгістрацыі можна зарэгістравацца на ЦТ у любы пункт. Аўтобусікі маглі б павучыцца!

***

Зрэшты, гэта маё ўспрыманне ЦТ, заснаванае на жыццёвым і прафесійным вопыце! Мяркую, што ёсць і іншыя думкі і, больш за тое, разлічваю на іх. Бо ЦТ, нават такое ідэальнае, як я тут апісала, непазбежна будзе развівацца далей. А значыць, тэма застаецца адкрытай...

**Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**
**Малюнак з інтэрнэту.**

***Прамежкавыя вынікі ўступнай кампаніі паказваюць, што "жарсці па вышэйшай адукацыі" не супакойваюцца. Пацвярджэннем таму ў чарговы раз сталі апошнія гадзіны прыёму дакументаў у ВНУ: значная колькасць абітурыентаў перакідвала дакументы на непапулярныя і нежаданыя спецыяльнасці, дзе паступленне было найбольш верагодным нават з вельмі нізкімі баламі.***
***Хочацца нагадаць, што ў гэтым годзе вышэйшыя навучальныя ўстановы прадастаўляюць толькі 25 тысяч месцаў на дзённай бюджэтнай форме. Астатнія прэтэндэнты на студэнцкія білеты будуць вымушаны вучыцца за кошт уласных сродкаў. Але і на платнай форме ўсім месцаў не хопіць. Тут самы час нагадаць, што непаступленне ў ВНУ — гэта не тупік. Вышэйшым навучальным установам ёсць вельмі добрая альтэрнатыва — сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. У гэтым матэрыяле мы паспрабуем гэта даказаць.***

# Альтэрнатыва ВНУ

## "У каледж — у крайнім выпадку"

З пытаннем "Ці разглядае хто-небудзь у якасці альтэрнатывы паступленне ў каледж?" я звярнулася да абітурыентаў, якія сканцэнтраваліся на подступах да прыёмнай камісіі адной са сталічных ВНУ пасля 18 гадзін 25 ліпеня. Адказы былі прадказальнымі: "Не, наўрад ці, нават не думаў аб гэтым", "Усе мае аднакласнікі паступаюць у ВНУ, і я таксама хачу вучыцца ва ўніверсітэце", "Калі не прайду па балах на бюджэт, буду вучыцца платна. Магчыма, на завочным", "На спецыяльнасці, якую я абраў, ёсць незапоўненыя месцы. Спадзяюся, мне маіх 140 балаў хопіць, каб паступіць", "У каледж? У крайнім выпадку".

Я далёкая ад думкі, што абітурыенты выбіраюць сярэднюю спецыяльную адукацыю па рэштлкавым прынцыпе: калі ў ВНУ паступіць не атрымалася. Упэўнена, што ў ССНУ ёсць свая мэтавая аўдыторыя. Але відавочна, што ў апошнія гадзіны рэгістрацыі дакументаў у прыёмных камісіях ВНУ тоўпіліся зусім іншыя людзі — тыя, хто любым шляхам імкнецца атрымаць вышэйшую адукацыю, нічога пры гэтым не ведаючы пра абраную спецыяльнасць і абсалютна не ўяўляючы, навошта ўвогуле ім гэтая адукацыя патрэбна. А магчыма, яны проста не ведаюць іншых магчымасцей, у тым ліку і тых, якія дае каледж? Аб іх і пойдзе гаворка далей.



## Сістэма, якая жыве сваім жыццём

Установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі прапаноўваюць вельмі шырокі спектр спецыяльнасцей. Так, сёлета абітурыентаў прымаюць 213 ССНУ, сярод якіх каледжы, тэхнікумы, прафесійна-тэхнічныя каледжы, гімназіі — каледжы мастацтваў, вышэйшыя каледжы і іншыя ўстановы, якія вядуць навучанне больш чым па 150 спецыяльнасцях і 240 спецыялізацыях (у тым ліку на аснове базавай адукацыі).

У сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі таксама, як і ў вышэйшай школе, увесь час адкрываюцца сучасныя, запатрабаваныя рынкам спецыяльнасці. Не ўсе народжаны для інтэлектуальнай працы (якой, дарэчы, з'яўляецца і вучоба). Важна зразумець своечасова, на што здатны менавіта вы. Магчыма, больш задавальнення вам дасць тое, што можна стварыць уласнымі рукамі, нават калі гэта рамонт аўтамабіляў ці камп'ютарнай тэхнікі. Упэўнена, што ў нашым грамадстве паступова будзе аднаўляцца павага да падобных прафесій, асабліва тых з іх, якія дазваляюць забяспечыць сабе і сваёй сям'і дастойны ўзровень жыцця.

Для аматараў "прэстыжнага" і "моднага" ў ССНУ таксама ёсць шмат прапаноў. Так, на гэты момант такімі з'яўляюцца спецыяльнасці, звязаныя з правазнаўствам, банкаўскай справай, маркетынгам, страхавой справай, бухгалтарскім улікам, архітэктурай, будаўніцтвам, праграмаваннем, тэхнічнай эксплуатацыяй аўтамабіляў, эксплуатацыяй электраабсталявання. Звычайна на бюджэтнае месца па гэтых спецыяльнасцях прэтэндуе больш за 5 чалавек. На працягу некалькіх гадоў сярод лідараў знаходзіцца і "Цырульніцкае майстэрства і дэкаратыўная касметыка".

Словам, сістэма сярэдняй спецыяльнай адукацыі — гэта цэлы свет, які жыве сваім жыццём, прычым вельмі цесна інтэграваным з вышэйшай школай. Але аб гэтым ніжэй.

## Першая адукацыя не павінна стаць апошняй

Большасць абітурыентаў, выбіраючы спецыяльнасць у ВНУ, думаюць, што яна на ўсё жыццё. Магчыма, гэта адна з прычын ажыятажнага попыту на вышэйшую адукацыю: 4—5 гадоў вучобы ў ВНУ — і прафесія пажыццёва забяспечана. Гэта вялізная памылка. Насамрэч першая адукацыя і першая спецыяльнасць можа ўсяго толькі закласці аснову вашай прафесійнай траекторыі. З пункта гледжання старту, сярэдняя спецыяльная адукацыя нічым не горшая за вышэйшую: на гэтым фундаменце вы можаце "дабудоўваць" і "надбудоўваць" сваю адукацыю, колькі заўгодна, у адпаведнасці са сваімі патрэбамі ці патрабаваннямі работадаўцаў. Гэта ў час нашых бацькоў у пашане былі людзі, якія ўсё жыццё працавалі на адной пасадзе. Зараз больш цэніцца мабільнасць, здольнасць адчуваць кан'юнктуру рынку і ўменне хутка запаўняць прабелы ўласнай адукацыі.

## Якія шляхі магчымы пасля ССНУ?

**1. Пайсці працаваць па спецыяльнасці.** Асабіста я ведаю даволі шмат паспяховых людзей з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. На пэўным этапе ўсе яны задумаліся аб атрыманні вышэйшай адукацыі, але падкрэслю: спачатку яны дасягнулі поспеху, а потым ужо завочна паступілі ў ВНУ, каб развівацца далей. Сярод іх — HR-менеджар буйной будаўнічай фірмы, галоўны бухгалтар рэспубліканскай газеты, некалькі індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца арганізатарскай і кіраўніцкай работай (кіруюць у тым ліку і спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй).

Упэўнена, што адсутнасць дыплома ВНУ — не перашкода для кар'ернага старту. Звычайна кіраўнікі арганізацый і камерцыйных фірм адзначаюць маладых і перспектыўных супрацоўнікаў і аплачваюць іх далейшую адукацыю, неабходную менавіта для гэтай арганізацыі ці фірмы.

**2. Паступіць у ВНУ па профілі спецыяльнасці.** Тут варыянтаў некалькі. Самыя аптымальныя з іх — скарочанае навучанне і завочная вучоба (поўны тэрмін). Калі вы вырашаеце працягваць адукацыю па профілі спецыяльнасці, то маеце адну істотную перавагу: можаце вучыцца ва ўніверсітэце за кошт сродкаў бюджэту.

Магчымасць скарочанага навучання ў ВНУ пасля каледжа трэба прадугледзець загадзя, ужо ў момант паступлення ў ССНУ: трэба пацікавіцца, з якімі ўніверсітэтамі каледж мае дагаворы аб такой форме падрыхтоўкі. Некаторыя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы нават уваходзяць у структуру ўніверсітэтаў і маюць інтэграваныя праграмы падрыхтоўкі спецыялістаў, вельмі зручныя для студэнтаў.

Што да завочнага навучання, то завочнік з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, на мой погляд, можа быць нават больш канкурэнтаздольным, чым яго малады калега — учарашні выпускнік дзённага аддзялення ВНУ. Таму што ССНУ даюць больш практыка-арыентаваную падрыхтоўку, у той час як выпускнік універсітэта можа быць найперш тэарэтыкам і адчуваць цяжкасці ў вытворчых умовах.

А ёсць і такія спецыяльнасці ў ВНУ, на якія рэальна паступіць толькі пасля каледжа (калі вы, канечне, не самародак). Напрыклад, гэта спецыяльнасці, звязаныя з музыкай, выканальніцтвам, выяўленчым мастацтвам, дызайнам. Практыка паказвае, што невялікую колькасць бюджэтных месцаў, якія вылучаюцца для творчых спецыяльнасцей, займаюць менавіта выпускнікі спецыялізаваных ССНУ.

**3. Радыкальна змяніць спецыяльнасць і паступіць у ВНУ на завочную форму.** Варта нагадаць, што завочнае навучанне не па профілі першай спецыяльнасці магчыма толькі на платнай аснове. Але і тут можна ўбачыць плюс: завочная адукацыя даволі даступная па кошце.

Гэты сцэнарый падыходзіць для тых, хто пры паступленні ў ССНУ памыліўся са спецыяльнасцю. Неасэнсаваны выбар прафесіі — вялікая праблема нашых выпускнікоў школ. Але гэтая памылка з разраду тых, якія можна выправіць. І выпускнікам каледжаў гэта зрабіць прасцей: менш часу і сродкаў выдаткавана на навучанне па нежаданай спецыяльнасці.

## Яшчэ некалькі аргументаў "за"

✓ Для паступлення ў ССНУ пасля 11 класаў неабходна прадставіць два сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання (а не тры, як у ВНУ): па дзяржаўнай мове і па профільным прадмеце. Верагоднасць паступлення ў каледж мэтазгодна разгледзець, напрыклад, тым абітурыентам, якія па тых ці іншых прычынах не здалі трэці тэст. Калі ж у вас ёсць тры сертыфікаты — гэта толькі пашырае вашы магчымасці: вы можаце выбіраць з дзвюх ці цэлага шэрагу спецыяльнасцей.

✓ На шэраг спецыяльнасцей ССНУ абітурыенты ўвогуле прымаюцца па конкурсе школьных атэстатаў. Гэтае правіла распаўсюджваецца на спецыяльнасці, дзе ў папярэдні год конкурс не перавышаў 1,5 чалавека на месца.

✓ Тэрміны ўступнай кампаніі ўстаноўлены такім чынам, што абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, паспяваюць падаць дакументы ў ССНУ.

✓ Урэшце, лепш быць "харашыстам" у ССНУ, чым троечнікам у ВНУ. Бо калі вы не прайшлі па конкурсе ва ўніверсітэт, то трэба прызнацца самому сабе: магчыма, вучоба ў ВНУ была б для вас непад'ёмнай. Адчуванне сябе аўтсайдарам усё роўна не дало б раскрыцца вашым здольнасцям.

Іна НІКІЦЕНКА.
nikitsenka@nastgaz.by

## Меркаванне

**Адказны сакратар Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына БУЦЬКО:**

"Сістэма сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на мой погляд, недаацэнена абітурыентамі, а дарэмна. Навучанне ў ССНУ для выпускнікоў агульнаадукацыйнай школы доўжыцца ад двух да трох гадоў (у залежнасці ад спецыяльнасці), пасля чаго выпускнік можа ісці працаваць, а значыць, ён сацыяльна абаронены.

Важна падкрэсліць, што дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі дае магчымасць заняць пасаду спецыяліста ў адпаведнасці з атрыманай кваліфікацыяй. Пры жаданні выпускнік ССНУ можа прэтэндаваць на атрыманне вышэйшай адукацыі ў скарочаны тэрмін. Такім чынам, малады чалавек, які выбірае падобны шлях, нічога не губляе — ні з пункта гледжання часу, ні тым больш з пункта гледжання станаўлення асобы і прафесіянала".

## Тэрміны падачы дакументаў у ССНУ

**Выпускнікі агульнаадукацыйных школ падаюць дакументы ў ССНУ з 15 ліпеня па 8 жніўня, калі прэтэндуюць на бюджэтнае навучанне, а да 14 жніўня можна падаць дакументы на навучанне на ўмовах аплаты.**